Зоя Заіка (Брэст)

## УНУТРЫМОЎНЫ ПРОЗВІШЧНЫ ТЫП У АРЭАЛЕ ПАГАРЫННЯ

Беларускае Пагарынне з'яўляецца паўднёвай гісторыка-этнаграфічнай часткай Заходняга Палесся на мяжы з Украінай. Як вядома, прозвішчы ўтрымліваюць зашыфраваную інфармацыю пра асаблівасці рассялення, шляхі гістарычнага развіцця народа, узаемаадносіны з іншымі этнасамі, адметнасці культуры, а таксама сведчаць пра моўныя асаблівасці ўтварэння і ўжывання слоў.

Прозвішчы на *-еня/-эня* утварыліся ад уласных мужчынскіх імён і іх формаў (Асташ – Асташэня, Арцём – Арцяменя) і ад антрапонімаў апелятыўнага паходжання, што абазначалі дзяцей паводле іх бацькоў (Крупеня, Кураленя, Дабрэня). Гэты тып больш распаўсюджаны ў паўночнай частцы Брэсцкай вобласці. У арэале Пагарыння ён сведчыць пра міграцыю насельніцтва з іншых рэгіёнаў Беларусі.

Унутрымоўны прозвішчны тып на моўнай тэрыторыі краіны непрадуктыўны,

ён складае толькі 3% ад агульнай колькасці.

Вытворныя (другасныя) прозвішчы ўнутрымоўнага тыпу [1] на *-онак/-ёнак* і на *-еня/-эня* бытуюць пераважна на тэрыторыі Беларусі, зрэдку сустракаюцца на сумежных з ёю тэрыторыях.

Прозвішчны тып на *-онак/-ёнак* таксама ўтварыўся ад асабовых мужчынскіх імён і ад антрапонімаў апелятыўнага паходжання. Прозвішчы гэтай групы абазначалі дзяцей паводле імён іх бацькоў (Далінóк, Шубянóк, Храмянóк). Як і тып на *-эня/-еня,* тып на *-онак/-ёнак* характэрны для паўночнага і цэнтральнага рэгіёнаў Беларусі. Наяўнасць на тэрыторыі Пагарыння прозвішчаў з фармантам *-онак/-ёнак* сведчыць пра перасяленне на Пагарынне жыхароў з іншых земляў Беларусі. На Пагарынні прозвішчы на *-онак/-ёнак* сустракаюцца рэдка (прыкладана 2%), і гэта ніяк не пярэчыць, а толькі пацвярджае агульную тэндэнцыю, уласцівую ўвогуле антрапанімічнай сістэме Беларусі. Прозвішчы ўнутрымоўнага пласта складаюць толькі некалькі працэнтаў ад даследаваных прозвішчаў Пагарыння. Сучасныя ўнутрымоўныя прозвішчы, як і прозвішчы іншых пластоў, уключаюць дэнататыўны кампанент семантыкі, але ў час іх утварэння або існавання як мянушкі заўсёды мелі канкрэтнае канататыўнае значэнне.

Апелятыўная лексіка, якая ляжыць у аснове сучасных прозвішчаў Пагарыння, характарызуецца шматпланавасцю зместу. Прозвішчы апелятыўнага паходжання ўнутрымоўнага тыпу ўтвараюцца ад nomina personalia (Гарбянок, Храмянок, Крупеня, Дабрэня, Старычэня) і ад nomina impersonalia (Петушэня, Шубянок, Зелянок, Дубянок, Струганок). Асобна выдзяляюцца прозвішчы, што пайшлі ад мужчынскіх кананічных імёнаў (Асташэня, Аляшчэня, Арцяменя, Васілёнак, Ахрамёнак). Унутрымоўны прозвішчны тып асацыіруецца з тымі ж лексіка-семантычнымі групамі апелятываў, якія характэрны для ўсходнеславянскага і агульнаславянскага тыпаў.

Сярод адапелятыўных прозвішчаў, утвораных ад nomina impersonalia, пераважаюць лексіка-семантычныя групы, што асацыіруюцца з назвамі свойскіх і дзікіх жывёл, птушак, рыб; з назвамі раслін і іх частак; з назвамі прылад працы, прадметаў побыту. Адапелятыўныя прозвішчы, утвораныя ад nomina personalia, дзеляцца на тры прыкладна аднолькавыя колькасныя групы, што асацыіруюцца з назвамі асоб па разумовых якасцях і асаблівасцях характару; па знешнім выглядзе і фізічных якасцях; па прафесіі ці занятку. Найбольш распаўсюджаныя кананічныя мужчынскія імёны, на аснове якіх утварыліся прозвішчы *Васілій, Георгій, Павел, Пётр, Сімеон, Савва.*

Прааналізаваныя антрапонімы збіраліся ў 2000-2003 гадах у палявых умовах, а таксама па спісах жыхароў сельскіх саветаў. У “Палескім архіве” Л. Вярэніча, які збіраўся на працягу 25 гадоў (1960-1985), у спісе антрапонімаў не сустракаюцца прозвішчы на *-эня/-еня, -онак/-ёнак.*

Этымалогія прозвішчаў не заўсёды празрыстая, зразумелая. У некаторых выпадках тлумачэнне з’яўляецца гіпатэтычным, і яго можна ўдакладняць на аснове новых матэрыялаў: дыялектных слоўнікаў, спісаў мікратапонімаў і інш.

**Літаратура**

1. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія : Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.